Czytelnik i ksiązka w Wielkim Ksiestwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. - Wroclaw, 1984. - 337 s.

[17] Wegierski W. Kronika zboru ewangelickiego krakowskiego. - Kraków, 1817. Аднoўленнае выданне твору В.Венгерскага 1651 г.; [Wegierski A.] Systema historico-chronologicum. Freistadii [Amsterdam], 1652. - S.124; Wegierski A. Slavonia reformata. - Amsterdam, 1679. - S.124; Sandius Ch. Bibliotheca Anti-Trinitarium (Appendix do Narratio compendiosa Wiszowatego). - Freistadii, 1684. - S.217; Lubieniecki S. Historia reformationis Polonicae. - Freistadii, 1685. - S.18; Lukaszewicz J. Dzieje kosciolów wyznania helweckiego w Litwie. - Poznan, 1843. - T.II. - S.178-179; Lukaszewicz J. Dzieje kosciolów wyznania helweckiego w dawnej Malej Polsce. - Poznan, 1853. - S.9; Balinski M., Lipinski T. Starozytna Polska pod wzgledem historycznym, jeograficznym i statystycznym opisana. - W-wa, 1886. - T.IV. - S.589; Brückner A. Mikolaj Rej: Studium krytyczne. - Kraków, 1905. - S.64; Katechizm brzeski 1553/1554 r. /Wstep i wyd. F.Pulaskiego // Collectanea Bibl. Ord. Krasinskich. - W-wa, 1908. - N1. - S.V-XXI; Pulaski F. Katechizm brzeski 1553/1554 r. // Pamietnik Literacki. - 1908. - 7. - S.320-344; Pulaski F. Wiadomosci o najdawniejszych i nieznanych drukach brzeskich 1553-1554 // Przeglad biblioteczny. - 1908. - N1. - S.121-126; Ptasnik J. Dukarze róznowiercy w Krakowie wieku XVI // Reformacja w Polsce. - 1921. - I. - S.188. Reiss J. Monogramy i akrostychy w religijnych piesniach reformacji polskiej // Reformacja w Polsce. - 1921. - I. - S.312; Ulanowski B. Jakub Przyluski i jego statut // Reformacja w Polsce. 1922. - 2. - S.250-251; Kawecka A. Koncjonaly protestanckie na Litwie w XVI w. // Reformacja w Polsce. 1926. - 4. - S.134; Jasnowski J. Mikolaj Czarny Radziwill (1515-1565) // Rosprawy Historyczne Towarzystwa Naukowego Warszawskiego. - 1939. - 22. - S.360-361; Kot S. Kanjonal brzeski Jana Zareby z 1558 r. // Reformacja w Polsce. - 1937-1939. - 9-10. - S.445; Piekarski K., Kot S. Szymon Zacjusz w Brzesciu // Reformacja w Polsce. 1937-1939. - 9-10. - S. 434--435.

[18] Евженко И.Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. - М., 1988. - С.69.

[19] Саверчанка І.В. Хрысціянскі Катэхізіс у кніжна-пісьмовай культуры ўсходніх славян эпохі Адраджэння і барока: атрыбуцыя, паэтыка, семіётыка. - Мн., 1998. - С.3.

[20] Нікалаеў М.В. Шэдэўры брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні. - Мн., 1989. - С.144 - 149.

[21] Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Бел. друк. літ. эпохі Рэнесансу. - Мн., 1990. - С.174.

[22] Евженко И.Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. - М., 1988. - С. 70.

[23] Саверчанка І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. - Мн., 1998. - С.53.

[24] Дадзіёмава В.У. Гісторыя музычнай культуры Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. - Мн.: Бел. гум. адук.-культурны цэнтр, 1994. - С.66.

[25] Іванова Л. З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі (другая палова XVI - першая палова XVII ст.) // 480 год беларускага кнігадрукавання: Матэрыялы трэціх Скарынаўскіх чытанняў. - Мн., 1998. - С.188.

[26] Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: Бел. друк. літ. эпохі Рэнесансу. - Мн., 1990. - С.177.

[27] Нікалаеў М.В. Шэдэўры брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні. - Мн.:Навука і тэхніка, 1989. - С.144 - 149.

**Л.І. Доўнар**

## РЭДКІЯ МІНСКІЯ ВЫДАННІ ПА МУЗЫЦЫ XIX ст.

Нотадрукаванне ў Мінску пачалося крыху пазней кнігадрукавання, што адпавядала агульнаму працэсу развіцця выдавецкай справы ў гэтай галіне. Неабходна адзначыць, што першыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускія нотныя зборнікі былі надрукаваны напрыканцы XVIII ст. як выданні каталіцкай царквы[1]. Аднак на тэрыторыі Беларусі ноты друкаваліся, як сведчаць даследчыкі, яшчэ з сярэдзіны XVI ст.[2] Са з'яўленнем новага літаграфічнага спосабу друку ў канцы XVIII ст. у Празе, які значна паскорыў нотадрукаванне, ужо на пачатку XIX ст. у Мінску выйшлі ў свет першыя выданні, якія змяшчалі нотны матэрыял. Вядомае нам сёння, дзякуючы даследаванню Я.С.Умецкай[3], адно з ранніх мінскіх выданняў – гэта "Spiew do poloneza", якое было надрукавана ў Мінскай губернскай друкарні ў 1817 г. на патрэбу мясцовай гімназіі ў якасці навучальнай праграмы па музыцы. Можна аднак меркаваць, што існавалі і іншыя нотныя выданні, надрукаваныя ў Мінску, бо дастаткова назваць прозвішча вядомага музыканта і кампазітара Пятра Карафа-Корбута, а таксама дырыжора і знакамітага музычнага педагога Дамініка Стафановіча, кампазітара і педагога Канстанціна Кжыжаноўскага, якія працавалі на ніве музычнай культуры Мінска і пра якіх часта згадваюць мастацтвазнаўцы як пра педагогаў С.Манюшкі, Ф.Міладоўскага, К.Марцінкевіч, М.Ельскага і іншых.

Просты і танны спосаб вырабу друкаванай нотнай формы прынёс асаблівыя вынікі і на Беларусь, калі ў 1850-1860-я гг. выданнем у Мінску літаграфскім спосабам свецкіх музычных твораў беларускіх кампазітараў-рамантыкаў заняўся Аляксандр Валіцкі[4], літаратар, музычны крытык, уладальнік кнігарні, якога звязвалі цесныя сувязі з шырокім колам прагрэсіўнай інтэлігенцыі. Так, накладам А.Валіцкага ў Мінску рыхтаваліся да выдання творы С.Манюшкі, Ф.Міладоўскага, В.Пшыборы. Найбольш пашчасціла з дасведчанасцю пра мінскія нотна-музычныя творы Фларыяна Міладоўскага. Творчасць кампазітара і музыканта ў 1850-60-я гг. прынесла яму вядомасць і славу. Яго творы выконваліся і друкаваліся побач з творамі С.Манюшкі ў Варшаве, Парыжы, Вене. Спадчына Ф.Міладоўскага вывучалася такімі беларускімі даследчыкамі як А.Мальдзіс, А.Ахвердава, Л.Касцюкавец, В.Скорабагатаў, якім удалося вызначыць, якія менавіта творы кампазітара былі выдадзены ў Мінску. Так, В.Скорабагатаў пацвердзіў, што аперэта "Konkurenci" на лібрэта У.Сыракомлі і М.Лапіцкага, упершыню выкананая ў Мінску ў 1861 г., была выдадзена ў тым жа годзе А.Валіцкім у Мінску асобнымі музычнымі нумарамі і асобна як лібрэта[5]. У артыкуле А.Ахвердавай прыводзяцца звесткі пра выданне ў 1860 г. А.Валіцкім у Мінску паланеза ў чатыры рукі "Для Міхася і Ясі"[6], а ў энцыклапедычным артыкуле Л.Касцюкавец, прысвечаным нотадрукаванню, змяшчаюцца ілюстрацыі тытульных аркушаў двух мінскіх нотных выданняў Ф.Міладоўскага: "Spiewy polskie" і названага ўжо паланеза, які па-польску мае назву "Michasiowi i Johasi: Cztere roreczny Polonez na Fortepian"[7]. У бібліяграфію Караля Эстрэйхера ўключана камедыя-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

опера пад аўтарствам Міхаіла Лапіцкага "z muzyka Floryana Miladowskiego" "Konkurenci" ("Канкурэнты"), але пазначана як віленскае выданне таго ж 1861 г.[8] У беларускай бібліяграфіі М.Васілеўскай яно падаецца так: "Lapicki M. Konkurenci. Opera komiczna w 2 akty. Minsk, 1861"[9]. Само ж выданне "Konkurenci: Komedjo-operetka we dwych aktach, przez Michala Lapickiego z muzyka Florjana Miladowskiego. Grana po raz pierwszy w teatrze Minskim 12 Lutego 1861 roku", якое можна знайсці ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве, было надрукавана ў Мінску "nakladem Alexandra Walickiego drukiem E.Adamowicza". Такім чынам, тэхнічны друк "Канкурэнтаў" быў здзейснены мінскім тыпографам Эмерыкам Адамовічам, як і некаторыя іншыя выданні А.Валіцкага: "Michasiowi i Johasi: Cztere roreczny Polonez na Fortepian" ([1860]), "Elementarz Scienny" (1862)[10]. На контртытуле выдання змешчаны фотаздымак актрысы Марыі Драздоўскай у ролі Актавіі з "Канкурэнтаў", зроблены прыватнай фірмай Антонія Прушынскага ў Мінску. Нот і асобных музычных нумароў з аперэты, якія, па сведчанні даследчыкаў, друкаваліся ў Мінску, адшукаць не ўдалося. Аднак з абвесткі на ніжняй вокладцы аднаго толькі мінскага выдання камедыі-аперэты "Канкурэнты" даведваемся, што накладам А.Валіцкага ў Мінску выйшаў "Polonez na 4 rece 37 i pul." Фларыяна Міладоўскага, а "wkrótce opuszcza prasse

Przybora, Witold. Polonaise pour le piano.
Wegierka. Polka.
Wyrwiduszka. Polka.

Miladowski Flor., Spiewy". Дарэчы, "Spiewy polskie. Serya I. Mazurek" былі выдадзены накладам А.Валіцкага і ў 1867 г. у Варшаве[11]. Калі пра мінскія выданні зборніка польскіх песень на словы польскіх паэтаў Л.Прусіноўскага і У.Вольскага "Spiewy polskie" ([1861]) і "Polonez" ([1860]) Ф.Міладоўскага можна атрымаць звесткі з вызначаных крыніц, то тры выданні Вітольда Пшыборы (Witold Przybora) сустрэліся нам толькі ў рэкламна-інфармацыйнай абвестцы мінскага выдання "Konkurenci". Можна выказаць толькі меркаванне, што "Polonaise pour le piano", "Wegierka. Polka", "Wyrwiduszka. Polka" В.Пшыборы Аляксандру Валіцкаму ўдалося выдаць у 1861 – 1863 гг.

У ліку аўтараў мінскіх нотна-музычных твораў Л.Касцюкавец названа прозвішча Каміла Марцінкевіч, піяністкі, кампазітара і педагога, дачкі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Аднак мінскія выданні К.Марцінкевіч таксама не выяўлены.

Яшчэ адно вядомае і значнае імя было ў цэнтры музычнай культуры Мінска – Станіслаў Манюшка. І, як адзначыў А.Мальдзіс, у 1843 г. у Мінску "Станіслаў Манюшка выдаў два сшыткі эцюдаў для фартэпіяна"[12]. Аднак ні вядомыя польскія бібліяграфічныя выданні, ні карткавыя каталогі не далі вынікаў у іх пошуку. У працы А.Валіцкага "Stanislaw Moniuszko" (Варшава, 1873) змешчаны сістэматычны спіс

твораў кампазітара, якія былі выдадзены, выдаваліся ці знаходзіліся на той час у рукапісу. Сярод выдадзеных твораў А.Валіцкі называе і выдадзеныя ўласна ім у Мінску ноты Станіслава Манюшкі. Гэта былі "Wlasny strój (Po co mi szukac zamorskihc mód)" і "Do Basi (Basiu, Basiu moja luba). Slowa F.D.Kniaznina"[13], пра якія мы даведаліся ўпершыню. Аднак А.Валіцкі не пазначыў год выдання гэтых двух асобных мінскіх нотадрукаў С.Манюшкі. З адпаведным 1843 годам у Мінску–Вільні выйшлі "utwory fortepianowe" "Fraszki, dwa zeszyty"[14], якія, відаць, і меў на ўвазе А.Мальдзіс. І хутчэй за ўсё выданне не было выданнем А.Валіцкага, бо яму на той час было ўсяго 17 гадоў. Мінскія нотадрукі С.Манюшкі не ўдалося адшукаць у асноўных кнігасховішчах Беларусі, Літвы, Польшчы. Іх рэдкасць выключная.

Некаторыя нотна-музычныя творы, падрыхтаваныя да друку, так і не былі выдадзены. Можна меркаваць, што распаўсюджванню нотна-музычных выданняў ў Мінску спрыялі мясцовыя кнігарні: у першай палове XIX ст. - А.Валіцкага, а ў другой палове XIX ст. - спецыялізаваны нотна-музычны магазін – М.А.Зубко-Васілеўскай[15].

Патрэбны далейшыя пошукі і, наогул, даследаванні ў галіне гісторыі беларускага нотадрукавання, якое з`яўляецца сведчаннем развіцця музычнай культуры Беларусі, яе распаўсюджвання шляхам мясцовага друку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Костюковец Л.Ф. Кантовая культура в Белоруссии: Массовые канты-гимны, лирические канты-псалмы. - Мн., 1975. - С.45.
[2] Касцюкавец Л.П. Нотадрукаванне // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. - Мн., 1987. - Т.4. - С.86.
[3] Умецкая Я.С. XIX – пачатак XX ст. Выданні на рускай мове // Кніга Беларусі. 1517-1917: Зводны каталог. - Мн., 1986. - С.278.
[4] Касцюкавец Л.П. Нотадрукаванне // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. - Мн., 1987. - Т.4. - С.87.
[5] Скорабагатаў В. Зайгралі спадчынныя куранты: Цыкл нарысаў з гісторыі прафесійнай музычнай культуры Беларусі. - Мн., 1998. - С.67.
[6] Ахвердава А. Фларыян Міладоўскі // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. - 1980. - №3. - С.39.
[7] Касцюкавец Л.П. Нотадрукаванне // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. - Мн., 1987. - Т.4. - С.86.
[8] Estrejcher K. Bibliografia polska. - Kraków, 1876. - T.3. - S.6.
[9] Василевская М.А. Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия: Библиография на иностранных языках. - Мн., 1983. - Ч.2. - С.371.
[10] НДАБ, ф.295, воп.1, спр.1077, л.78а; Estrejcher K. Bibliografia polska. - Kraków, 1870. - T.5. - S.10.
[11] НДАБ, ф.295, воп.1, спр.1077, л.78а; Estrejcher K. Bibliografia polska. - Kraków, 1870. - T.5. - S.10.
[12] Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе: з гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры. - Мн., 1969. - С.116.
[13] Walicki A. Stanislaw Moniuszko. - Warszawa, 1873. - S.128-129.
[14] Stanislaw Moniuszko / Opracowal J.Prosnak. - Kraków, 1968. - S.184.
[15] Иванов Г. Нотоиздательское дело в России: историческая справка. - М., 1970. - С.27.